# А. Р. ЛУКАШЭНКА ПРЫНЯЎ С. С. ЛІНГА І ПАГУТАРЫЎ З С. У. КІРЫЕНКАМ

8 чэрвеня 1998 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка прыняў прэм'ер-міністра С.С.Лінга.

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка беларускай дзяржавы, прэм'ер-міністр далажыў прэзідэнту аб гатоўнасці да правядзення 10 чэрвеня пасяджэння Выканкама Саюза Беларусі і Расіі пад старшынствам Старшыні Выканкама — прэм'ер-міністра Расійскай Федэрацыі С.У.Кірыенкі.

С.С.Лінг праінфармаваў прэзідэнта краіны аб дамоўленасці з прэм'ер-міністрам Украіны В.П.Пуставойценкам правесці пасяджэнне беларуска-украінскай камісіі, дзе плануецца разгледзець ход выканання Пратакола і Пагаднення аб развіцці тавараабароту паміж дзвюма краінамі, падпісаных у ходзе візіту ўкраінскага прэм'ер-міністра ў Рэспубліку Беларусь.

С.С.Лінг таксама далажыў кіраўніку дзяржавы аб асноўных выніках свайго візіту на Кіпр.

У ходзе сустрэчы абмеркаваны дзеянні ўрада па кантролю за ходам нарыхтоўкі кармоў і падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю 1998 года. Прэзідэнт адобрыў правядзенне ўрадам рэспубліканскай селектарнай нарады па гэтых пытаннях 11 чэрвеня гэтага года.

* * *

Па ініцыятыве прэм'ер-міністра Расійскай Федэрацыі С.У.Кірыенкі адбылася яго тэлефонная размова з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкам.

Абмеркаваны пытанні правядзення намечанага на 10 чэрвеня г.г. у г.Мінску пасяджэння Выканкама Саюза Беларусі і Расіі.

* * *

У сярэдзіне тыдня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка мае намер наведаць прадпрыемствы мясной і малочнай прамысловасці г.Мінска і на прыкладзе мінскіх прадпрыемстваў разгледзець стан і меры па далейшаму паглыбленню перапрацоўкі зыходнай сыравіны і пашырэння асартыменту прадукцыі, даступнай розным слаям насельніцтва, што выпрабляецца ў рэспубліцы.

**БЕЛТА.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ